Чума обычно начинается как общим угнетенным самочувствием, потерей аппетита, лихо адкой, так и одновременным проявлением тех или других признаков чумы, чаще же всего сыпи и воспаления глаз (глаза закисают), скоро же к этим признакам присоединяются признаки заболевания органов дыхания или пищеварения. При заболевании органов дыхания появляется истечение из носа, хриплый голос, кашель и т. д., при заболевании органов пищеварения прежде всего, как и при брюшном тифе у человека появляется воспаление слизистой оболочки ротовой полости, языка (налеты), а потом понос и т. д. Конечно, возможны случаи одновременного заболевания органов дыхания и органов пищеварения. При заболевании органов пищеварения часто можно наблюдать рвоту и усиленную жажду.

Кровавый понос у щенят весьма подозрительный признак на чуму, но, конечно, нельзя забывать и того, что такой понос может быть и при разного рода отравлениях, у старых же собак и при другой заразной болезни, какую мы назовем кишечным тифом собак (Штутгартская болезнь).

При нервной форме чумы, может быть воспаление мозговых оболочек (менингиты) и самого головного мозга, а также спинного мозга, отсюда же ясно, что при нервной форме чумы могут наблюдаться не только судороги и параличи, но точно также ранее этого признаки возбуждения у собаки (при менингитах). Но все-таки наичаще нервная форма чумы выражается полными или неполным параличами и самыми разнообразными формами судорог тех или других мышц.

Ко всем этим признакам заболевания чумою могут присоединяться и другие менее заметные, а именно воспаление почек и заболевание сердца (эндокардит), последнее заболевание останется и после выздоровления собаки в виде так называемых пороков сердца, что особенно ясно будет заметно у охотничьих собак.



„Чайка“—Масловского (Харьков). Золотая медаль на Всесоюзной выставке в Москве

Все эти заболевания могут комбинироваться в весьма прихотливых комбинациях.

Из изложенного ясно, что чума— болезнь, поражающая весь организм больной собаки, вот почему она дает часто совершенно неожиданное течение.

Позволю себе высказать свой взгляд на чуму собак. Чумной вирус, который я отношу к фильтрующимся, весьма летучий и заразный, прежде

всего вызывает общее заболевание организма с высокой температурой и т. д. Он насыщает весь организм и может вызвать заболевание тех органов, которые, по тем или другим причинам, наиболее склонны к заболеванию, т. е. которые имеют наименьшую самозащиту. Случайное расстройство кишечника делает то, что чума принимает обостренную кишечную форму, случайное, скажем, для простоты, заболевание органов дыхания от простуды вызывает обостренную чуму органов дыхания, как это бывает при инфлюэнцы человека. Потом же в больных (воспаленных) органах и тканях могут поселяться другие микробы и еще более осложнять течение болезни. Возможно допустить какое то особое влияние чумной инфекции (заразы) на нервную ткань. Полагаю, что из изложенного делается вполне понятным почему чума протекает то более тяжело, то более легко.

*Предсказание* (прогноз) при данном заболевании может быть дано только осторожное, в связи с интенсивностью заболевания и в связи с тем, какие органы и насколько поражены. Можно считать наиболее легкой и неосложненной чумой кожную форму, а также чуму с признаками воспаления глаз. Кишечная форма чумы, если нет каких-либо значительных осложнений, также может считаться более надежной, чем чума с значительным поражением дыхательных органов, особенно же легких и наконец самой неблагоприятной формой чумы в смысле полного выздоровления будет нервная форма. Воспаление почек и эндокардит мы будем рассматривать как тяжелые осложнения болезни. Во всяком же случае смертность при чуме колеблется очень значительно от 30 до 80 проц. больных.

*Лечение*. Весьма большое значение имеют при чуме гигиенические условия содержания больных, а также кормовой режим. По мнению некоторых весьма больших авторитетов, уже одними гигиеническими и диэтическими мероприятиями можно *„спасти больше половины животных“*. Не оспаривая этого мнения, я все-таки должен добавить, что самое важное в борьбе с чумою возможно раннее обращение к врачу за помощью. При современных условиях наших знаний всегда возможно оказать радикальную помощь больному, в ранней стадии болезни, даже не прибегая к специфическому лечению, о котором буду говорить ниже.

Больному животному должно быть предоставлено теплое, сухое и светлое помещение, питательный и обильный белками корм. Всякое пристрастие к овсянкам должно быть оставлено. Больному дают хороший бульон и мясо, но не жирное в вареном или даже сыром виде, безусловно свежее. Когда болезнь осложнится сильным воспалением кишечника, тогда врач установит соответствующую диэту: молоко, рисовый отвар и т. д.

Рекомендовано весьма много лечебных средств в борьбе с чумою, но чаще всего все они не дают надежных результатов в смысле прекращения болезни, а поэтому всем этим средствам мы придаем только чисто местное и симптоматическое значение „Закисают глаза“ и безусловно необходимо их промывать два, три, четыре раза какой-либо дезинфецирующей жидкостью, чаще всего борной водой, хотя бы в 2—3%. При сильной сыпи на коже можно порекомендовать спиртовой препарат: салициловую кислоту 1:10, креолин 1:10, ихтиоловую мазь и т. д. Можно также припудрить всасывающими порошками, напр., крахмал и цинк пополам (Amyltritic Zinc. oxydat, a. a 30,0). При обнаружении заболевания органов дыхания можно прибегнуть к антисептическим вдыханиям (инголяции), напр. ментол с водой 1 : 100 (Mentholi 1,0, Aq. destill. 100,0). При бронхите и бронхопневмонии прикладывают горчичник, или смазывают грудь иодом. Для усиления отхаркивания можно рекомендовать такой раствор 3 раза в день по чайной-столовой ложке: Natr. benzoici 10—20,0 Aq. destill 300,0. При кашле можно давать успокаивающие напр. Доверов

порошок в дозах 0,05—0,5, 2—3 раза в день. Одновременно можно при поражении органов дыхания давать настойку дигиталиса: Infus fol. Digital. ex 0,5—1,0 : 150 0, настоять 1/2 часа, давать по чайной десертной или столовой ложке, смотря по величине собаки.

При слабости сердца дают в виде подкожных ин'екций: Coffeini, Natri benzoici a. a 1,0, Ag. destill. 40,0, 2—3 раза в день по 1—3,0 каждый раз (до 5,0). В период уже разрешения процесса можно рекомендовать рассасывающие: Natr. jodat. 1,0—2,0, Aq. destill. или sirup Simpl. 150,0

При поражении кишечника можно рекомендовать порошки каломеля: Calomel 0,1 — 0,5, Sacchari albi 20,0. M. f. pulv. D. in part aegual. N 20 DS. по одному порошку утром и вечером с молоком или более сложный: Salol, Bismuth. salicyl. a. a Carbon. pulverati a. a. 1,0—10,0

Было предложено много химических препаратов для общего действия против чумы, не вдаваясь в подробности. Мы укажем только некоторые, иногда оказывающие благоприятное действие. Из мышьяковистых препаратов Natrium cocodylicum подкожно или в мышцу 0,05--0,1 в повышающихся и понижающихся дозах. Из препаратов серебра: Argentum colloidale (колларгол) 1—2 проц. раствор 10,0—30,0, 2—3 раза подкожно или в вену в 1 день. Из анилиновых красящих веществ: Trypanum caeruleum 1 проц. раствор 3,0—20,0 в вену, или 5,0—25,0 подкожно. Из иодистых препаратов Jodum trichloratum 1 проц. раствор 5,0—10,0 повторные подкожные ин'екции. Рекомендуются многие другие, но нет оснований перечислять все их, тем более, что во всех этих случаях надо обратиться к врачу, который будет применять средства, соответственно той обстановке, какая будет наблюдаться.

Перейдем теперь к *сывороточному лечению*. История этого вопроса довольно многолетняя. Сперва, как это вполне понятно, возник вопрос о специфической противочумной сыворотке, но так как все другие животные не заболевают чумой собак, то и была приготовлена в разных лабораториях противочумная сыворотка от переболевших и гипериммунизированных собак. Несомненно, иногда такая сыворотка оказывает хорошее действие на больных собак, обрывая болезнь в ранней степени ее развития.



„Тревожка"—англо-русская выжловка Белкохотсоюза. Большая серебр. медаль на Всесоюзной выставке в Москве.

Потом с развитем учения о проеиновой терапии (лечение чуждыми организму белками) в последние годы стали применять белки в виде чуждых организму сывороток, в виде молока и т. д. Выяснилось, что чуждые организму белки оказывают весьма сильное влияние на чумной вирус в начальной стадии заболевания, ослабляя его.

В конце концов мой личный опыт учит следующему: применение нормальной сыворотки лошади в виде ин'екций 1,0—3,0 в мышцу (большие дозы лишни:) в начальной стадии заболевания, весьма часто совершенно обрывает болезнь, видимо влияя на самый чумной вирус и не давая ему возможности усиливаться в зараженном организме. Уже после первой ин'екции, если только болезнь не запущена, через два дня приводят собаку на вторую ин'екцию совершенно неузнаваемую, веселую с хорошим аппетитом, но иногда еще

с повышенной температурой. Быть может я наблюдал эпизоотии со сравнительно слабым вирусом, но факт остается фактом, сыворотка лошади оказывала целебное действие на больных собак, но только в начальной стадии заболевания, т. е. когда еще нет разных осложнений болезни. Мои наблюдения подтверждаются опытами А. А. Богдановского (Витебск) и Орлова (Омск). Я хорошо знаю, что иногда сыворотка не давала, по другим наблюдениям, такого эффекта, но нужно найти об'яснение этому. С своей стороны я убедился и в том, что нормальная сыворотка лошади не однокачественный препарат, бывают как более деятельные, так и менее деятельные сыворотки. Но отчего-бы это не зависело, всегда можно опытным путем иметь сыворотку лошади высокого против чумы действия. Вдаваться в дальнейшие подробности по поводу действия сыворотки в данной статье не могу, это более специальная тема. Повторяю, опыт указал, что злоупотреблять большим количеством сыворотки не следует, она может угнетать организм. Мы никогда не вводили сыворотку в вену, вполне достаточно в мышцу, простым быстрым уколом в кожу в области более крупных мышц. Но я никогда не стараюсь глубоко вкалывать иглу, достаточно коснуться хотя-бы неглубоко той или другой мышцы. Полагаю, что можно давать и третью ин'екцию тоже через день. Эта третья ин'екция еще не угрожает явлениям анафилаксии, т. е. сывороточного отравления.



„Чок"—Борисова. Лучший пойнтер на Всесоюзной выставке в Москве

*Профилактические мероприятия* при чуме должны быть самые тщательные. Нужно позаботиться о дезинфекции собачьих помещений, а также нужно убирать кал и мочу больных. Но этого мало. Никогда не следует забывать и того, что каждая новая собака может принести с собою чуму, а следовательно ее нужно держать отдельно около двух недель. Собачьи выставки, собачьи пансионы (за границей), учреждения для дрессировки также могут быть разносчиками заразы. Но все-таки подчеркну, что преувеличивать все эти опасности нет оснований. В Харькове я ежедневно принимал 30—40 собак, среди них почти всегда были чумные, но я никогда не слышал жалобы на то, чтобы другие собаки заражались чумою в клинике.

В заключение приглашаю всех любителей собак и охотников, прежде всего, хорошо изучить чуму, чтобы иметь о ней ясное понятие. Знание в этом деле уже дает половину успеха в борьбе с данной болезнью истинным бичем племенного собаководства. Мне пишут, что на Урале промысловые охотники принимают самые исключительные меры к отделению своих здоровых щенят при появлении чумы, но почти всегда безрезультатно. Быть может скоро настанет время, когда мы будем делать предохранительные прививки нормальной сывороткой в тех условиях, когда имеем перед собою дорогих пользовательных собак подозрительных по заражению, но пока еще не настало время говорить об этом.

Можно пожалеть о том, что крупные об'единения охотников еще не ставят на очередь вопрос о рациональных мерах борьбы с чумою, а за это пора было бы взяться. Твердо верю в то, что взаимные усилия специалистов и данной профессиональной организации были бы не безрезультатны.




**Н. О.**

# „Зачараваная" стрэльба.

У ГУМНЫ, на агароды ўпёрлася хата Ерамея Сяргеевіча — з вуліцы адразу і ня прыкмеціш: ці гэта хата; ці гэта хлеў чый з бровен вокнамі на агароды, задам на вуліцу. Але Ерамею Сяргеевічу гэта спадручна: каму трэба па справе, знойдзе і з агародаў, а бяз справы, дзеля цікавасьці, або начальству якому спатрэбіцца, дык і ня знойдуць,—бяды асаблівай ня здарыцца.

Перад вокнамі вішнёвы садок, а за ім агароды, гумны і палі. Увесну садок увесь у белых кветках; у салодкай млявасьці асыпаюцца пялёсткі і шапацяць паблеклыя. Малады куст калакалушы, перасаджаны з лесу, ужо з другога году дае пах—ён баламуціць удоўую галаву Ерамея Сяргеевіча. Падоўгу сядзіць ён вечарамі пад калакалушаю і нечага чакае. Ля ног трэцца аблезлы кабель Ігрaй і таксама ўздыхае і глыбока нюхае вячэрнія пахі вясны. Калі палі прыносяць вячэрнюю сьвежасьць, і за ракою гасьне барвяная паласа захаду, мякка і палка пачынаюць сьвісьцець перапёлкі і стомна надрываюцца ў нескладанай песьні дзеркачы. Вечар пухкаю сарвэтаю накрывае вішнёвы садок і Ерамея Сяргеевіча і аблезлага сабаку Ігрaя, які пераажыў са сваім гаспадаром адзінаццаць такіх-жа вёснаў. Ерамею Сяргеевічу здавалася, што ён у гэтай імгле бясьсільна мятусіцца, як муха ў павуціньні—прыходзіла злосьць і на калакалушу, і на жыцьцё сваё ўдоўе, і на Ігрaя. З прыкрасьці ён піхаў ігрaя босай нагою і, не азіраючыся, ішоў у хату, а Ігрaй, панурыўшы галаву і скавычучы, цягнуўся пад ганак.

Так чарадаваліся веснавыя калакалушавыя вечары. А раніцамі, ці пахмурнымі, ці сонечнымі яны былі, усё роўна, Ерамей Сяргеевіч адзяваў акуляры, падвязваючы іх вяровачкаю на галаве і садзіўся да вакна чытаць эвангелію. Раніцою-ж зьяўляліся і наведвальнікі. Звычайна першым прыходзіў стары паляўнічы Іван Панфілавіч. Ён пабожна хрысьціўся на абразы, садзіўся ля другога вакна хаты і заводзіў „мудрыгельскія" гутаркі.


Наведвальнік доўга раскурваў люльку...

— Вось, напрыклад, скажам, вужака... Чаму ты вужачае вока на мушку насаджваеш. Гэта і кожны можа: забіў вужаку, вочы павыварачваў ёй, аблупіў скуру, насадзіў на мушку і, будзьце ласкавы, паўтара рублі за палепшаньне. А чаму, запытаньне, вужака. А калі яшчарку, або, скажам, жабу...

Ерамей Сяргеевіч працягваў чытанку. Наведвальнік доўга раскурваў люльку, яна сіпела, хрыпела і нераскурвалася, быццам выпрабоўвала цярплівасьць свайго гаспадара.

— А, вось, у Ляшчыхах зьявіўся знахар—дык знахар,—зноў пачынаў Іван Панфілавіч.

Ерамей Сяргеевіч падымаў галаву ад эвангелія і чакаў. Іван Панфілавіч зноў раскурваў люльку і ўрачыста заключаў:

— Вужачай крывёю дзейнічае.— Потым абое маўчалі, прыглядаліся, узаемна чытаючы думкі.

Ерамей Сяргеевіч ведаў, што Іван Панфілавіч даўно імкнецца вызнаць яго рамяство—загаворваць стрэльбы. Вось і ў гэту раніцу Іван Панфілавіч за тым-жа самым прышоў.

— Памрэш-жа, каму справу сваю ты перадасі,—угаварваў ён.—Цэлая акруга, як бяз рук, застанецца без цябе. А тут я, паляўнічы, можна сказаць, з першых. Перадай мне, навучы. Да тваёй сьмерці слова ад мяне ніхто аб гэтай справе не пачуе.

Ерамей Сяргеевіч ухмыльнуўся:

— Рана хаваеш. Я, можа быць, яшчэ і цябе перажыву.—І, падумаўшы, дадаў:

— Вужаку, браток, таксама трэба; вужакі яны ўсялякія бываюць: якія для загавору, а якія наадварот—біла стрэльба, а стане, бадай, пасьля гэтай вужакі яшчэ горш біць.

Пад вокнамі нехта загаманіў і пры яцелі змоўклі.

У хату ўвайшоў чалавек з падвязанай ваўнянай хусткай сківіцай, у руках яго была шомпальнаяаднастволка, уся перацягнутая дротам і заржавеўшая.

Іван Панфілавіч з цікавасьцю агледзіў увайшоўшага, зірніў мільгом на Ерамея Сяргеевіча і, жадаючы паказаць, што справа яго не датычыцца і ня цікавіць, уставіўся ў вакно.

Наведвальнік зьняў шапку, скоса ў бок перахрысьціўся на абразы і загаманіў, уставіўшыся на пук нейкай травы, што была падвешана да столі над драўняным ложкам у куце.



У хату увайшоў чалавек...

— Да цябе, Ерамей Сяргеевіч. Ужо гэтак стала біцца, а да таго яшчэ і пудлюе...

Ён зьняў з пляча стрэльбу і падаў Ерамею Сяргеевічу. Той спакойна прыняў аднастволку і пачаў яе аглядаць. Ложа была размалёвана прыгожымі ўзорамі: тут былі лётаючыя матылі, бясхвосты журавель, адзінокі куст і ля яго ні то лось, ні то хатні бык, мірна скубаў сінюю траву. У кутку ложа было выпалена імя ўласьніка—„Васіль Качэргін“.

— Сынок гэта ў мяне, Рыгорка, майструе,—растлумачыў Качэргін аб малюнках.—Хварэў я, а ён усю ложу спаскудзіў. І, ці паверыш, з таго самага часу біцца яна стала, і пудляваць, ня дай божа, як пудлюе! зайца неяк стрэліў, а ён крывёю выходзіць і бяжыць. Ледзь дагнаў. І ўсю сківіцу разьвярнуў.

Качэргін зьняў хустку і паказаў распухшую сківаўцу.

Ерамей Сяргеевіч да таго часу закончыў агляд і рашуча сказаў:

— Рубель, каб ня пудлявала і паўрубля, каб сківаўцу захаваць... Грошы наперад...

Качэргін здрыгануўся, вінавата ўхмыльнуўся, у хваляваньні пацёр хворую сківаўцу і ласкавым тонам праказаў: восем грыўняў у мяне, Ерамей Сяргеевіч.—Зрабі ласку... Качку калі-небудзь занясу звыш таго, або там цецярука занясу... Ужо адслужу.

Сьледам за тым Качэргін выцягнуў з кішэні шматку, разьвязаў яе і высыпаў на стол жмэню медзякоў. Ерамей Сяргеевіч пералічыў іх і паклаў у кішэню.

— Пятака не хапае,—заўважыў ён і, ня гледзячы на наведвальніка, працягнуў руку.

Качэргін палез у кішэню, але нічога там не знайшоў.

— Зноў-жа, сынок пажартаваў,—прагаварыў ён вінавата:—выцягнуў з кішэні пятак, ды, мабыць, на гарбузікі аддаў.

— Ну ўжо няхай,—сказаў Ерамей Сяргеевіч,—зраблю, толькі глядзі наконт качак паклапаціся. Заўтра зайдзі ў гэты час—будзе гатова.

Качэргін, здаволены, ухмыльнуўся, падвязаў сківаўцу і хутка вышаў, баючыся, як-бы Ерамей Сяргеевіч не зьмяніў сваей пастановы.

Іван Панфілавіч адарваўся ад вакна і падышоў да Ерамея Сяргеевіча:—дай-жа хоць стрэльбу паглядзець.

— Паглядзі, ды толькі ўсё роўна ты нічога не разумееш, хоць і паляўнічы, —ухмыльнуўся Ерамей Сяргеевіч.

Іван Панфілавіч узяў аднастволку, агледзіў яе з усіх бакоў, на неваштапакалупаў пальцам у рульцы і нездаволена паківаў галавою.

— Ды яж-бы з гэтакай рулькі за грэх лічыў страляць. Тут аднэй гразі больш чым на маёй сьвіньні.

Ерамей Сяргеевіч не адгукаўся.

— Можа пры мне будзеш рульку настройваць,—з асобнай мяккасьцю —запытаў Іван Панфілавіч.—Нічога ня вучы, а толькі дазволь паглядзець. Пяць рублёў за гэта дам.

Ерамей Сяргеевіч хітра ўхмыльнуўся, махнуў рукою на госьця і накіраваўся да дзьвярэй. За ім вышаў і госьць і, не разьвітваючыся, пайшоў на вуліцу.

Ерамей Сяргеевіч, як быў босы, так і вышаў у садок. Паўднёвае сонца запаляла смарагды-лісты калакалушы, топазамі гарэла ў зялёным палоне вішнёвых дрэў. Малочная сінь неба здавалася яшчэ больш празрыстай. Па парканах курылася лёгкім дымком нагрэтае паветра. Ерамей Сяргеевіч сеў проста на траву пад вішняй, тварам да хаты, каб не прагледзіць мажлівых наведвальнікаў. Іх, па праўдзе, звычайна бывала ня шмат, але ўдаваліся дні, калі заходзілі троечацьвёра паляўнічых і тады Ерамею Сяргеевічу клопатаў было па горла,—з кожным трэба было пагаварыць, з кожным даводзілася таргавацца, а з вечара пачынаўся „рамонт“ стрэльбаў. Але сёньня быў толькі адзін Качэргін і наўрад ці хто яшчэ будзе—можна не сьпяшацца.

Ля самае хаты, на высокай жэрдцы шпакоўніца. Там клапоцяцца цэлы дзень шпакі. Ерамей Сяргеевіч ўтаропіўся на шпакоў, задумаўся аб сваім жыцьці ўдоўім і так, за думкамі, ды за шпакамі, не заўважыў, як вечар павольна наплываў у сад, а за цемраю ня бачыў, як Рыгор Качэргін на гару, як цень, праляцеў. Не заўважыў нічога гэтага Ерамей Сяргеевіч і апамятаваўся толькі тады, калі зрабілася зусім цёмна, і ня відаць было ня толькі шпакоў, але і дзьвярэй хаты. Ерамей Сяргеевіч занепакоіўся і пашоў дадому. Рыгор Качэргін ад бацькі чуў, што той занёс стрэльбу загаварыць да Ерамея Сяргеевіча, і што, напэўна, увечары ён будзе яе „напраўляць“. Рыгор і сам з бацькавай стрэльбай на паляваньне хадзіў і моцна спадзяваўся атрымаць яе ў спадчыну, а таму, даведаўшыся, што бацька занёс стрэльбу загаварыць, раззлаваўся і парашыў вечарам прасачыць за „работаю“ стрэльбавага чараўніка.

На гары цёмна. То тут, то там спатыкаўся Качэргін аб нейкія бочкі, зачапіў нагою старое вядро, яно загрымела, і прышлося, схаваўшыся за пячным комінам, некалькі хвілін счакаць. А ў хаце было, як раней, ціха. У куце гары, супроць таго месца, дзе, па мяркаваньні Качэргіна, павінны былі быць у хаце абразы, ён асьцярожна разгроб пясок і адшукаў у столі вузкую шчылінку. Лёг на пясок і прылажыў адно вуха да шчыліны. У хаце яшчэ нікога ня было. Але вось увайшоў Ерамей Сяргеевіч і запаліў лямпу. Потым узяў аднастволку Качэргіна, уважліва яе аглядзеў і пачаў рабіць нейкія падрыхтаваньні: зьліваў у бляшаную конаўку вадкасьць з аднэй бутэлькі, шаптаў над ёй, у тую-ж конаўку ўліў вадкасьць з другой бутэлькі, зноў пашаптаў і ўсё гэта ўліў у рулю стрэльбы. З капсуля паказаліся чорныя кроплі. Сваё чароўніцтва Ерамей Сяргеевіч закончыў тым, што перавязаў рулю ля самай мушкі аднэй травінкай з пучку травы, што вісела над ложкам.

Качэргін, здаволены нагляданьнямі, хутка зьлез з гары і пашоў дахаты.

Наступны дзень быў падобны да мінулага. Як і заўсёды, зайшоў „па дарозе" Іван Панфілавіч, аглядзеў загаворанную стрэльбу і паківаў галавою.

— Ужо пасьпеў апрацаваць,—прагаварыў ён, ківаючы на стрэльбу. Ерамей Сяргеевіч моўчкі павесіў стрэльбу на сьцену і стаў займацца з чыгунком ля печы.

— Гаспадыню-б табе, Ерамей Сяргеевіч, добрую знайсьці—альбо сумленную ўдаву, або дзеўку старую. Цяжка табе аднаму спраўляцца.

— Бяз бабы кепска, а з цяперашнімі бабамі яшчэ горш будзе,—адгукнуўся на гэты раз Ерамей Сяргеевіч.

Іван Панфілавіч перавёў гутарку зноў на загаворы, выцягнуў быў з кішэні бутэльку гарэлкі, але ў гэты момант у хату ўвайшоў Рыгор Качэргін, і Іван Панфілавіч, як і заўсёды пры наведвальніках, адвярнуўся да вакна.

— Бацька за стрэльбаю прыслаў,—прагаварыў Качэргін.—Нешта занядужаў ён сам, дык вось мяне і паслаў,—растлумачыў ён.

Са стрэльбаю Рыгор не пайшоў дадому, а панадворкамі вышаў проста на іржышча і там, ля кусту ялоўцу, пачаў разглядаць зачарованую стрэльбу.

Пакруціў яе ў руках, панюхаў у капсулю, панюхаў у рулю і ўхмыльнуўся.

— Вось яна справа тут у чым,—праказаў ён голасна і яшчэ раз панюхаў у рулі. Потым набраў жменю ялоўцу і заткаў яго шомпалам да канца рулі.

Бегам прыбег Рыгор дадому, аддаў бацьку стрэльбу, а сам узьлез на печ і пачаў выглядаць, што будзе рабіць бацька са стрэльбаю. Той асьцярожна паставіў стрэльбу ў кут і пачаў апранацца.

— Бацька, куды гэта ты хворы зьбіраешся?

— Пойдзем стрэльбу прабаваць,—паклікаў бацька Рыгора.—Хоць па вароне ды папрабаваць трэба, грошы, бач, не маленькія аддаў...

— А калі яна зноў цябе стукне па скуле,—азадачыў Рыгор.

Але бацька, як-бы там ні было, абавязкова хацеў папрабаваць зачараваную стрэльбу, і яны накіраваліся на тое іржышча, дзе толькі што Рыгор набіў стрэльбу ялоўцам.

Бацька акуратна набіў стрэльбу, надзеў пістон і нарыхтаваўся страляць—па краю поля, кроках у дваццаці, хадзілі дзьве вароны. Вычакаўшы, калі яны зышліся разам, ён стрэліў.

Пш-ш-ш-бух, пачуўся слабы, з вялікай зацяжкай стрэл, відаць было, як шрот, ледзь даляцеўшы да варон, кінуўся ў пясок.

Рыгор не сьцярпеў і зарагатаў:

— Вось дык загаварыў...

Бацька з паўхвіліны зьдзіўлена глядзеў на стрэльбу, потым моцна вылаяўся і так шпарка накіраваўся ў вёску, што Рыгор ледзь пасьпяваў за ім.

Ерамей Сяргеевіч вёў гутарку з наведвальнікам, калі Качэргін увай-

шоў да яго ў хату са стрэльбай у руках.

— Давай назад грошы,—праказаў ён,—раней хоць да крыві біла, а цяпер і крыві няма...

— А ў скулу б'е?—запытаў зьбянтэжаны Ерамей Сяргеевіч.



— ... Давай назад грошы; раней хоць да крыві біла, а цяпер і крыві няма

— У скулу біць хоць і перастала, аднак, грошы аддавай назад, няма чаго людзей абдурваць. Кіем хутчэй заб'ю, як цяпер гэтай стрэльбай.

— Ды ты ня вельмі разыходзься,—пакрыўдзіўся Ерамей Сяргеевіч: — першую тваю стральбу ці што загарваю. Я іх мо' ужо тысячу направіў. Давай сюды тваю дубіну.

Качэргін падаў стрэльбу. Ерамей Сяргеевіч паглядзеў у капсуль, у рулю і зараз-жа нездаволена працягнуў:—вось дык штука... Гэта я, значыцца, ня той нагавор табе зрабіў...

— Што-ж цяпер, як-жа я буду?—спалохаўся Качэргін.

— Прыдзецца табе яшчэ паўрубля заплаціць: трэба адгаварыць—у старое становішча, значыцца, прывесьці, а потым-жа зноў загаварыць,—пераконваў Ерамей Сяргеевіч.

Тым часам прысутнічаўшы пры гутарцы паляўнічы няпрыкметна ўзяў сваю стрэльбу і вышаў. Калі Ерамей Сяргеевіч успомніў аб ім, дык той ужо быў на вуліцы. Качэргін падумаў, і рашыў пакуль што стрэльбу не адгаварваць—час яшчэ будзе, да паляваньня далёка.

Дні стаялі сонечныя. Зоры палыхалі зарывам. Усё ў прыродзе расло, шырылася і цягнулася ўгару да сонца. З палёў надыходзіў востры пах жыта і траваў. У лясох стаяў нязмолчны шчэбет птушак. А па дварох, у вёсцы, з шпакоўніц выглядалі жоўтыя дзюбкі маладых шпакоў. У адзін такі дзень Рыгор Качэргін, накасіўшы ў сваім агародзе травы цяляці, лягжаў пад вярбою і прыдумваў плян выкрыцьця Ерамея Сяргеевіча. Уласна кажучы, плян быў даўно гатовы, але Качэргін ня прыдумаў яшчэ, як правесьці яго. То ён уяўляў сябе гаворачым на сялянскім сходзе прамову, у якой ён выкрывае Ерамея Сяргеевіча, то ён бачыць яго, што той зракаецца назаўсёды чараўніцтва.

Між тым, слава Ерамея Сяргеевіча пасьля выпадку са стрэльбаю Качэргіна, здавалася, пачала хістацца: наведвальнікаў з кожным днём рабілася ўсё менш, нават у далёкіх вёсках даведаліся аб гэтым выпадку, прычым апавяданьне пра стрэльбу Качэргіна прымала самыя дзівосныя формы. Нехта нават перадаваў, што пасьля загавору гаспадар стрэльбы, стрэліўшы ў варону, папаў набоем у праходзіўшую ззаду яго жанчыну.

Рыгору Качэргіну ўсё гэта было толькі на-руку. Абмяркоўваць досыць—пара дзейнічаць, парашыў ён.

Аднавяскоўцы бачылі, як Рыгор хадзіў у воласьць, а потым доўга гутарыў з старшынёю сельсавету і паказваў яму нейкую паперку.

Была якраз нядзеля. Старыя павыходзілі з царквы. Ерамей Сяргеевіч таксама быў у царкве, і цяпер, праходзячы міма сельсавету, захацеў паслухаць, што на сходзе будуць казаць.

— А гэты птах навошта тут,—падумаў ён, убачыўшы Рыгора Качэргіна. І трывога сьціснула сэрца.

Аднак, віду не падаў Ерамей Сяргеевіч і, прывітаўшыся з старымі, сеў на прызьбе.

— Таварышы, грамадзяне,—чуе ён як у сьне голас Рыгора,—тут адбылося ўсеагульнае памрачэньне, дзякуючы чараўніку Ерамею Сяргеевічу. Вось ён перад вамі, дарагія грамадзяне.—І пашоў валіць Рыгор Качэргін, адкуль толькі што бралася. Хлапчуку 17 год, а гаворыць, як дарослы. Расказаў, як у бацькі стрэльба ня біла і па скуле назад аддавала, як бацька занёс стрэльбу да Ерамея Сяргеевіча, пра сваё падарожжа на гару таксама не ўтаіў, і як бацька варон страляў.

— І вось, грамадзяне, перад вамі несьвядомы элемэнт. Між тым уся яго палітыка ў наяўнасьці. Вось, напрыклад, чаму бацькава стрэльба ня біла: бруду ў ёй воз было, і трэба было яе прачысьціць. І што-ж, грамадзянін добры—Ерамей Сяргеевіч налівае ў рулю газы—шэпча, налівае масла—шэпча, а стрэльба сыпле, як гарох з дзіравага мяшка. Восем грыўняў аддаў бацька, ды яшчэ цяпер паўрубля зьбіраецца несьці. Вось яна гэта стрэльба, набітая.—Бацька, пакажы сюды.

Васіль Качэргін вышаў на сярэдзіну са стрэльбаю.

— Я яе вычысьціў,—казаў далей Рыгор,—і пачала біць дасканала, і ніякага мардабою. Ну, а вось цяпер, грамадзянін Ерамей Сяргеевіч няхай гэту самую стрэльбу так загаворыць, каб зноў ня біла. Хваліцца ён бацьку, што, моў, магу загаварыць, і так і гэтак: захачу—будзе біць, захачу—і жабы з яе не заб'еш.

Ерамей Сяргеевіч пацеў ад напружаньня, жылы на віскох надуліся, усё нутро вываравалася, а слоў адпаведных ня было, каб адказаць Рыгору-урвісу. Нарэшце, ён моўчкі вышаў на сярэдзіну, выцягнуў з кішэні бутэлечку з бурай вадкасьцю і ўзяў ад Рыгора стрэльбу.

Усе з напружаньнем сачылі за Ерамеем Сяргеевічам. Нават Рыгор Качэргін адкрыў ад зьдзіўленьня рот. Ерамей Сяргеевіч, стараючыся захаваць спакой, агледзіў стрэльбу, падзьмухаў на неважта ў рулю і тры разы нарысаваў вакол сябе круг стрэльбаю. Потым, з тварам, поўным цьвёрдае рашучасьці, выліў з бутэлечкі ў рулю тры кроплі, зноў нарысаваў тры разы круг і нешта пачаў шаптаць, нахіляючыся да самае рулі стрэльбы.

— Цяпер страляй,—праказаў Ерамей Сяргеевіч са злосьцю, падаючы стрэльбу Рыгору.—Хоць у мяне страляй, хоць браму замыкай,—усё адно цяпер гэта ня стрэльба.

Рыгор узяў стрэльбу ад Ерамея Сяргеевіча і з запалам крыкнуў:—ну, айда, грамадзяне, стрэльбу прабаваць.

З цікавасьцю ішлі сяляне за Рыгорам і Ерамеем Сяргеевічам.

За ваколіцаю ўсе спыніліся. Рыгор надзеў пістон і, загадзя адчуваючы перамогу, усьміхаючыся пaглядзеў на Ерамея Сяргеевіча.

— А ну, калі і праўда, ня будзе біць,—прагаварыў нехта.

— Кажу, няхай у мяне страляе,—пераконваў Ерамей Сяргеевіч:—няхай ідзе да брамы сабе новы запор рабіць.

— Калі так, вешай сваю шапку на плот,—запрапанаваў нехта.

— Праўда, шапку няхай вешае, шапку,—падтрымалі адразу некалькі галасаў.

Ерамей Сяргеевіч з жалем пагледзеў на ўсіх і, з горкасьцю ўсьміхнуўшыся, павесіў на плот сваю шапку, пашаптаў над ёю, плюнуў спачатку ў адзін, а потым у другі бок і адышоўся.

— Ну, трымайся цяпер,—адважна выкрыкнуў Рыгор, адышоўся крокаў на пятнаццаць ад плоту і стрэліў.

На тым месцы, дзе вісела шапка, засталася шматка, а ля плоту валяліся кавалкі яе.

— Вось дык здорава. Вось дык загаварыў... Ну Рыгор... Разуважыў чараўніка,—пачулася з усіх бакоў.

Ерамей Сяргеевіч, без шапкі, агародамі пабег дадому. Вецер кудлачыў яго валасы, рукі, быццам прывязаныя ад другіх плячэй, целяпаліся, не пападаючы ў такт руху. Народ застаўся далёка ззаду, а Ерамей

Сяргеевіч усё бег. Вось ужо і яго агароды, і садок, і хата, і сабака Іграй вылез з-пад ганку і ў зьдзіўленьні віляе аблезлым хвастом.

Сядзеў у гэты вечар Ерамей Сяргеевіч пад вішнямі з Іграем і старанна абдумваў усё, што здарылася. Ня было сонца. Калматае воблака сцаплялася адно з другім і навісала над вёскаю цёмнаю хмараю. Шапацелі ад набягаўшага ветра вішнёвыя лісты. Надзьмуўшыся сядзеў на страсе шпакоўніцы стары шпак, а з вакенца шпакоўніцы выглядалі адразу дзьве жоўтых дзюбкі маладых шпакоў. Іграй цёрся аб калені Ерамея Сяргеевіча і паціху скавытаў, а калі здалёк пачуўся першы грукат грому, ён завыў цяжкімі ўздохамі, павольна ўзьнімаючы ўгару абмызганую пляшывую галаву. І ад гэтага выцьця, і ад павольнага насуваньня хмар і яшчэ ад таго, што сканфузіў на ўсю акругу Рыгор Качэргін, зрабілася несьцярпіма балюча Ерамею Сяргеевічу. Ён схадзіў у хату за стрэльбаю, што пакінулі ў яго для загавору яшчэ напярэдадні гэтага ганебнага дня, набіў яе, і ў раздум'і спыніўся ля шпакоўніцы. Пачалі капаць цяжкія кроплі дажджу. Іх глухія ўдары цяжкім молатам адстукваліся ў галаве Ерамея Сяргеевіча. Але паддавацца свайму настрою ён не хацеў. Ад прыкрасьці падняў стрэльбу ўгару, у напрамку шпакоўніцы і, ня цэлячыся, стрэліў у жоўтыя дзюбкі маладых шпакоў. Там раптам стала ціха і, занепакоіўшыся, сунуўся ў вакенца стары шпак. Зараз-жа захлістаў касымі ўдарамі дождж. Бліснула бліскучая маланка і на хвіліну асьвятліла агароды і сад. Ерамей Сяргеевіч пад ударамі дажджу раптам супакоіўся, думкі сталі яснымі, і неяк само сабою прышло правільнае вырашэньне пытаньня: заўтра ён пойдзе ў сельсавет і папросіць зямлі, а на каня і збрую грошай хопіць. І ад такога рашэньня зрабілася зусім лёгка, быццам новае жыцьцё на новым месцы пачынае будаваць Ерамей Сяргеевіч.

---

**Я. Відук.**

# Карцеччу па шэрых.

Лес не на шутку пранік галасамі;
Гоман, і рэха і хрускат сукоў.
Шамаюць жоўтымі ногі лістамі,
Шамаюць пухам апалых лістоў.

Людзі прышлі, скаланулі сабою
Раніцы ціхай васеньнюю дрыж.
Што яны будуць рабіць грамадою?
Нашто ім дубіны, стрэльбы, нажы?

Лес не на шутку пранік галасамі;
Гоман, і рэха і хрускат сукоў.
Гэта прышлі на расправу з ваўкамі,
Гэта прышлі патрывожыць ваўкоў.

З прывязі спушчаны „злосныя мопсы“
Яхкаюць нема, сапуць ганчакі.
— Справа заходзьце, ды хутка-ж,
вы, хлопцы!
Біце, страляйце! Здаровы каб крык!..

Бедненькі шэрык, цябе выганяюць,
Вельмі ўжо даўся сваім ты зубом.
Тулішся недзе, скалішся, знаю,
Лоўка-б хацеў сьлізгануць між кустоў.

Але абступілі людзі й сабакі,
Рэжацца пораху едкага дым.
Воўчае волі бунтуецца накіп,—
Лыскі прывыклі адшукваць сьляды.

— Зьлева заходзьце, хутчэй-жа,
зарэзы!
Біце, страляйце! Здаровы каб крык!..
... Выгналі іх, нават некалькі разам...
Выгналі з лесу, на гала, ў кусты.

Бедныя шэрыкі, вас зацкавалі,
Вельмі даліся сваім вы зубом.
. . . . . . . . . . . . . .
Цела карцеччу, агнём пранізала,
Льлецца на поплаў з падстрэляных
кроў...

---

**Мак. Пасьлядовіч.**

# Удача.

(*Нешта сапраўднае*).



АДНАГО разу, калі я пасьля працы сядзеў дома і разьбіраў прысланыя пісьмы, у пакой уваліўся мой стары знаёмы па паляваньню Хведар Карналь і, сеўшы каля стала, прагаварыў ні з таго, ні з сяго:

— Ты едзеш заўтра?

Я кінуў пісьмо на стол і глянуў у яго бок:

— Куды гэта я еду?

— Як куды!? Хіба ты забыўся, што заўтра па балоце і каля рэчак будзе грымець страляніна. Людзі будуць лузаць нашу дзіч, а мы тут паседжваем і спакойна праглядваем сяброўскія пісьмы! Не, брат, гэтак рабіць ня варта. Загадваю табе зараз-жа арганізаваць свайго „Заўэра“ і ўсе жывыя і няжывыя прыпасы, а наконт транспарту—гэта значыць, купіць білеты—пастараюся я. Чуеш, цягнік адыходзіць а палове трэцяй. Я пашоў. Ня думай толькі, урэшце, захварэць на што-небудзь. Няма часу з табою валэндацца. А другой гадзіне я да цябе забягу...

І ён з шумам хутка выбег, як і зьявіўся, пакінуўшы мяне ў такім становішчы, калі чалавек, зьбіты чым-небудзь спанталыку, ня ведае за што раней ухапіцца. Было дванаццаць гадзін дня. Праз дзьве гадзіны трэба бегчы на вакзал, але да гэтага трэба падрыхтавацца. Я адчыніў шафу і выняў стрэльбу.

Закінутая яшчэ з зімы, яна за недахопам часу ні разу ня чысьцілася. Крук пабурэў ад жоўтых плям іржы, і правы баёк, калі я закрыў затвор і кляпнуў, упарта не хацеў варочацца на сваё месца, ня пушчаючы падымацца патроньнікам. Унутры ствалы былі зацягнуты ні то павуціньнем, ні то тонкай сажай ад парахавога нагару.

Праз поўгадзіны, неяк з большага ліквідаваўшы прыметныя воку недахопы, я выняў з шуфляды скрынку з розным начыньнем. Але там знайшоў толькі пустую ад пораху банку, кіло „воўчаку“, тры набітыя нявездама якімі нумарамі шроту патроны і дваццаць пустых гільзаў. Пасьля належнага агляду восем гільзаў давялося выкінуць за вакно, а дванаццаць прызнаць годнымі. Усіх патронаў, лічачы і набітыя невядомымі нумарамі шроту, было пятнаццаць. Гэтага мала для паляўнічага, які выяжджае ў экспэдыцыю з гораду ў вёску. Звычайны запас патронаў маіх сяброў бывае ў такіх выпадках каля сотні.

Я схапіў шапку і выбег з дому. Потым, успомніўся адзін з лёзунгоў Аўтадору (які паміж іншым, яшчэ нідзе ня быў надрукаваны), што лепш ехаць на машыне, чым ісьці пехатою, вярнуўся ў пакой і забраў вэласыпэд (ад маёй кватэры да паляўнічае крамы больш вярсты).

Было часу роўна гадзіна. Я з усіх сіл націскаў на пэдалі, якія да таго-ж вельмі гарэзьліва пішчэлі, зьвяртаючы і на вэласыпед і на яго гаспадара ўвагу ўсіх працоўных, якія ў гэты час праходзілі па вуліцы.

Неяк з горам папалам дабраўшыся да Савецкай (дом № 71), я ўвайшоў з „канём“ у краму і папрасіў тэрмінова адважыць шроту (6 нумар), адлічыць 50 гільзаў (70 мілімэтраў—толькі не зялёных; у патроньнік, падлы, ня хочуць лезьці!). Яшчэ патрэбен порах і банка капсулёў.

— Няма ў нас гэтага,—адказаў загадчык крамы, — дамо вам шроту (ёсьць, колькі хочаце!), дамо вам капсулі, а за порах і не зялёныя 70-мілімэтровыя гільзы—выбачайце. Усё гэта праз тыдзень, ці нават у гэту сераду будзе...

І ўсё-ж такі пораху і гільзаў (не зялёныя, а сінія—гэтыя ідуць у па-

троньнік) я дастаў. Дастаў, праехаўшы яшчэ паўвярсты, у магазыне спартыўнага таварыства „Дынамо“.

Праўда, і там вышла маленькая недарэчнасьць: я не захапіў з дому білету на права паляваньня, а без яго пораху не дастанеш і на зельле, а ня то, каб страляць дзіч. Варочацца не хацелася, ды й час быў дораг. Я выняў дазвол на рэвальвэр і, падаючы яго раўнадушна загадчыку магазыну, прагаварыў:

— Тады дайце мне пораху па гэтым пасьведчаньні. Дзеля эканоміі, я сам буду набіваць рэвольвэрныя патроны.

Але мне загадчык не даў веры і сказаў, што гэтакі продаж пораху, магчыма, можа пашырыць браканьерства. А дзічы ў нас і так мала, каб яе расстрэльваў і паляўнічы з дазволам і браканьер. Тут патрэбна нейкая цьвёрдая лінія і ён, загадчык крамы, будзе яе праводзіць...

Калі я зьвярнуўся ўжо другі раз з кніжачкай, якая сьведчыла, што я па ўсіх артыкулах і палажэньнях маю права зьнішчаць качак цецярукоў у дазволены час, патрэбнае было выдадзена бяз спрэчак. А другой гадзіне я зьвярнуўся дахаты, дзе мяне ўжо чакаў Карналь.

— Ну, цяпер можна і набіваць патроны. Усё, здаецца, закуплена.

— Цяпер набіваць патроны?!--ускочыў з ложку Карналь, нездаволена паглядаючы на мяне.—Да ты ведаеш, што мы можам спазьніцца на цягнік. Лепш возьмем усе прыпасы і прылады, а набіваць будзем у вагоне...

Я падзівіўся з разумнай развагі майго сябра і, піхаючы ў паляўніцкую сумку патрэбнае, параіў яму ісьці адвязаць „Цэзара“.

* * *

Усе вагоны былі біткам набіты людзьмі. Мы знайшлі сабе месца толькі на верхніх полках. Сабаку загналі пад ніжнюю полку і даручылі трымаць маладому хлапцу, які быў захоплены нашым ваяўнічым выглядам і сьпешкай. Было відаць, што гэты хлапец некалі будзе адважным паляўнічым, калі ўжо з маленства пачынае выяўляць задаткі гэтай слаўнай прафэсіі, ні то спорту.

Мы сядзелі пад самай стольлю вагона, сагнуўшыся ў тры пагібелі. У нізе гудзеў рознымі галасамі народ. Моладзь гаманіла аб школе, ехаўшыя з кошыкамі спэкулянты—аб цэнах на вішні, масла. Нейкі стары дзядзька, тыкаючы нагою ў бок майго сабакі, упэўнена гаварыў свайму суседу па лаўцы,—чалавеку з партфэлем, відаць, раённага маштабу:

— І гэта добры сабака, кажаце вы? Гэта ён будзе выпорваць дзічыну з кустоў?—Не, як відаць, ён здатны коўзацца толькі па пярынах, а ня лазіць па балоце. Вось у мяне некалі быў сабака. Па дваццаць качак за дзень прыносіў дахаты...

Агульная гаворка ў аддзяленьні вагону крыху супынілася. Народ пачаў прыслухоўвацца да таго, што казаў стары.

— А як вы клікалі свайго сабаку?— з сьвядомасьцю ў справе спрэчак запытаў хлапец, што трымаў майго сабаку.

— Ды проста, так і клікаў: цюцька. Ах, добры быў „цюцька“! Бывала, перад Пятром, як выйду з ім на рэчку, дык толькі спраўляйся скручваць качкам галоўкі...

Тут Карналь ня вытрымаў і, павярнуўшыся на полцы так, што рассыпаў банку з порахам, прагаварыў, зьвесіўшы галаву ўніз:

— Ну, відаць, дзядзька, „добрае“ было некалі паляваньне, што цяпер дзічына рэдкай стала. Каб мы ўсе так паляўнічылі, дык зьвярыны й на завод-бы не засталося.

— Ат, што з вамі будзеш гаварыць: вельмі-ж яе ўжо распладзілася ад вашага пра-ві-льнага паляваньня; заўсёды ў горад пустымі едзеце...

Цягнік супыніўся і стары, ня выказаўшы сваіх думак, вышаў на станцыю.

Цямнела, калі мы пад'яжджалі да месца нашай астаноўкі. Патроны былі, з горам папалам, набіты. Праўда, у час набіўкі выявілася адна маленькая недарэчнасьць: ня было ў нас пыжоў, але пасьля некаторых разваг, мы з посьпехам замянілі іх

газэтнай паперай, якой былі ўкручаны нашы прыпасы яды. Калі супыніўся цягнік, я выходзіў з яго ўжо гатовы па першай адзнацы страляць па малой і вялікай зьвярыне.

— Ну, а цяпер куды пойдзем?

Карналь нешта раздумваў, пыхкаючы з люлькі махоркай. Потым ускінуў на плячо стрэльбу:

— Чэрці яго ведаюць, куды ісьці. Апанас з Закарчоўя павінен быў па нас прыехаць, але, мусіць, забыўся, падла. Такія ўжо ў яго мазгі.

Тым часам з задняга вагону вывалілася з шумам і гамам, брэнчучы стрэльбамі, група паляўнічых—чалавек з 15. Сярод іх я заўважыў свайго знаёмага—Тараса Дзідрыка.

— Ты гэта, Тарас, куды сабраўся?

— Еду ў Галынкі. Там, брат, качак і цецярукоў усім паляўнічым Менску не перабіць. Адсюль недалёка—вёрст васемнаццаць будзе... Ну, бывай пакуль што, а то месца на падводзе мне не пакінуць.

— Трэба пехатою ісьці ў Закарчоўе—уздыхнуў Карналь.—Мо' гэтыя сем верст не намарудзяць ногі.

* * *

Зачырванеў усходні небасхіл, праганяючы ноч на захад. Буйныя кроплі халоднай расы дрыжаць на лісьці прыдарожных кустоў. Над лугам зьвіс клоччам туман. Лёгкі ветрык шаснуў у кустох, зганяючы з лісьцяў начны накіп вады. Недзе далёка адазваліся кнігаўкі і замоўклі, мусіць, зьдзіўленыя неадзыўчывай цішынёй летняе раніцы. Вёрст за чатыры ад нас, каля Залужжа, глуха бухнула стрэльба.

— Пачынаецца...

Карналь злосна плюнуў у бок. Ён ня мог цярпець, калі хто раней за яго прабіраўся ў багатыя на дзічмесцы. Раптам ён ажывіўся і прагаварыў:

— Ведаеш, Пятрок, што мы цяпер зробім?

— Не, ня ведаю.

— Ну, дык слухай. У Залужжы, як відаць, зьбярэцца шмат паляўнічых. Распудзяць качак і яны палятуць...

—...на Сечанскае возерца, дзе мы летась лавілі рыбу,—перабіў яго я.— Ну, і што з гэтага выйдзе?



... Глуха бухнула стрэльба

— А выйдзе тое, што мы засядзем у прыазёрных кустох і будзем бяз промаху лузаць качак!

Яшчэ раз я падзівіўся сьвядомасьці майго сябра ў паляўнічых пытаньнях. Ажыўленыя будучай удачай, мы рынуліся, не разьбіраючы дарогі, да возера. Раптам Карналь, які бег наперадзе, зьнік, і я пачуў бултыханьне, а пасьля лаянку.

— Хведар, дзе ты?

— Дзе?! У выжарыну ўскочыў, каб яна агнём пашла! А ўсё гэта дурная сьпешка...

Выбраўшыся з выжарыны, увесь з галавы да ног упэцканы ў гразь і ціну, Хведар павольна пасунуўся да возера, за ім я, а за мною, нешта абнюхваючы ў кустох, бег лукаткамі сабака.

— Чуеш, крэкчуць!—зьвярнуўся з шэптам да мяне Хведар, калі мы падышлі да возера і супыніліся ў

кустох.—Вунь, бачыш, плавае пара крыжаноў. А ну, выпалім, каб сораму ня было.

Ён нэрвова выцягнуў з сумкі патроны, адчыніў зварот і... моцна выляўся.

— Што з табой сёньня, Хведар? Што здарылася?

— Тое здарылася, што патроны разьмяклі і ня хочуць лезьці ў патроньнік. Ня вытрымалі ванны ў выжарыне...

Я яго супакоіў тым, што хоць у мяне патроны 70 мілімэтраў, а яго патроньнік бярэ 65, але гэта ня бяда: канцы патронаў можна абрэзаць... абгрызьці—спахваціўся я, успомніўшы, што мы не ўзялі з сабой нажа.

Далёка грымела страляніна, а мы сядзелі ў кустох і згрызалі доўгія патроны. Над галавамі сьвісталі крыльлямі крыжаны і з шумам садзіліся на бліскучую паверхню азёрнае вады.

